**Эмануіл Іофе**
*Мінск*

# АРЫГІНАЛЬНЫ ТАЛЕНТ ВУЧОНАГА, ПАЭТА І ПАЛІТЫКА

Сёння ўжо ніхто не аспрэчвае таго факта, што беларускі народ — адзін з самых таленавітых народаў свету. Сыны і дачкі гэтага народа ўнеслі істотны і значны ўклад не толькі ў айчынную, але і ў еўрапейскую і сусветную навуку і культуру. Можна адзначыць без перабольшання, што сярод імён, якія складаюць гонар і славу беларускага народа, пачэснае месца месца займае імя Ігната Дварчаніна.

Яго жыццёвы шлях пачаўся ў вёсцы Погіры Слонімскага павета (цяпер Дзятлаўскага раёна) Гродзенскай губерні. Менавіта тут 8 чэрвеня 1895 г. у сям'і малазямельнага (усяго пяць дзесяцін малаўрадлівай зямлі з сенажаццю) арандатара Сымона Дварчаніна і яго жонкі Кацярыны нарадзіўся чалавек шматграннага таленту Ігнат Дварчанін. У гэтай шматдзетнай сям'і выхоўвалася пяць сыноў (Ясь, Юзік, Гіляры Ігнат, Мікалай) і чатыры дачкі (Вольга, Юля, Дар'я, Ганна).

Другі том біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменнікі» (Мінск, 1993) называе Ігната Дварчаніна паэтам, літаратуразнаўцам, удзельнікам заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Трэці том «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» (Мінск, 1996) вызначае І. С. Дварчаніна як дзеяча нацыянальнага руху, літаратуразнаўца, паэта. Шосты том 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі» (Мінск, 1998) — як беларускага літаратуразнаўцу, паэта, публіцыста, грамадскага дзеяча.

Жыццёваму і творчаму шляху гэтага чалавека прысвечаны кнігі А. Баршчэўскага, А. Бергман, Е. Тамашэўскага «Ігнат Дварчанін — беларускі палітык і вучоны» (Варшава, 1990) і Я. А. Місарэвіча, М. Д. Каралёва «І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс» (Гродна, 1995), шэраг газетных і часопісных артыкулаў. Але яшчэ і сёння ў даследаванні жыцця і творчасці гэтай асобы нямала «белых

плямаў». У іх ліквідацыі аўтару гэтых радкоў дапамаглі разнастайныя апублікаваныя і неапублікаваныя крыніцы, у тым ліку фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Дэталёвы і аб'ектыўны аналіз жыцця і творчасці Ігната Сымонавіча дае падставы лічыць яго чалавекам шматграннага таленту і выключнай эрудыцыі, арыгінальным вучоным-літаратуразнаўцам, гісторыкам, культуролагам, публіцыстам, паэтам, здольным перакладчыкам, настаўнікам, выкладчыкам, педагогам, выдаўцом, аўтарытэтным палітыкам, рэвалюцыянерам, барацьбітом за правы працоўных Заходняй Беларусі, культурна-асветным і грамадскім дзеячам, адной з цэнтральных фігур нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, асабліва ў 1920-х гг.

Не трэба забываць, што гэты чалавек пражыў усяго 42 гады.

Нельга не згадзіцца з наступнай думкай перакладчыка дысертацыі І. С. Дварчаніна Тамары Кароткай: *«Зрэшты, такое суквецце талентаў, сканцэнтраваных у адной асобе, было заўсёды ўласціва часу гістарычных зрухаў, калі абуджаны народны дух прагна шукаў свайго выйсця»*[1].

Калі пастушку Ігнату споўнілася сем гадоў, ён пачаў наведваць мясцовую школу. Праз чатыры гады бацька пачаў арандаваць зямлю каля мястэчка Дзятлава, здольны падлетак стаў хадзіць у Дзятлаўскую школу вышэйшай ступені, якая рыхтавала народных настаўнікаў. Нягледзячы на адсутнасць у праграме гэтай школы такіх прадметаў, як алгебра, усеагульная гісторыя, родная і замежная мовы, яна прабудзіла ў юнага Ігната цікавасць да ведаў, якая не пакідала яго ўсё жыццё.

17-гадовы Ігнат Дварчанін пасля сканчэння школы здаў экзамен і атрымаў званне народнага настаўніка. За тры гады працы ў вёсцы Хмяльніца Слонімскага павета ён праявіў сябе здольным педагогам, адным з любімых вучнямі настаўнікаў.

У маі 1915 г. 19-гадовы Ігнат быў мабілізаваны ў армію і неўзабаве апынуўся пад Коўнам на фронце. Праз пяць дзён яго

[1] Кароткая Т. Ад перакладчыка // Дварчанін І. С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мінск: Навука і тэхніка, 1991. С. 5.

выклікалі ў штаб палка і ў складзе запаснога батальёна камандзіравалі ў Цвер. У Цвярскім рэальным вучылішчы Ігнат здаў іспыты на вольнаадпісанага 2-га разраду. У красавіку 1916 г. Дварчанін скончыў 1-ю школу прапаршчыкаў у горадзе Араніенбаўме (цяпер г. Ламаносаў) і служыў у запасным палку ў Маскве. З восені 1916 г. ён у званні падпаручніка да лета 1917 г. ваяваў на Заходнім фронце ў складзе 43-га сібірскага стралковага палка.

Сярод аднапалчан і вайскоўцаў суседніх воінскіх часцей было нямала беларусаў. Так Ігнат Дварчанін пазнаёміўся з кіраўнікамі рэвалюцыйных гурткоў беларусаў-вайскоўцаў Сымонам Рак-Міхайлоўскім, Аляксандрам Чарвяковым, Язэпам Дылам і іншымі. Нягледзячы на вялікую занятасць, ён знаходзіў час, каб павысіць сваю адукацыю. З гэтай мэтай Ігнат Сымонавіч вывучаў нямецкую мову, алгебру і іншыя прадметы за курс сярэдняй школы. Нельга не згадзіцца з думкай беларускага гісторыка Мікалая Бандарэнкі, што імкненне Ігната Дварчаніна да ведаў не толькі здзіўляла саслужыўцаў-афіцэраў, але і прыцягвала да яго як да чалавека сур'ёзнага і мэтанакіраванага.

Ваенная кар'ера падпаручніка Ігната Дварчаніна скончылася ў чэрвені 1917 г., калі пачаўся развал расійскай арміі. Ён прыехаў у Мінск, стаў супрацоўнічаць у газеце «Вольная Беларусь». Менавіта з гэтага часу ўсё жыццё Ігната Сымонавіча было цесна звязана з беларускім нацыянальным рухам. Ён удзельнічаў у з'ездзе беларусаў-вайскоўцаў Заходняга фронту, быў абраны ў Выканаўчы камітэт, затым стаў членам Беларускай вайсковай рады, якая аб'ядноўвала беларускіх вайскоўцаў розных франтоў.

Ігнат Дварчанін уступіў у Беларускую сацыялістычную грамаду і прыняў удзел у якасці сакратара ў рабоце яе з'езда, які праходзіў з перапынкамі 14–28 кастрычніка 1917 г. З болем Ігнат Сымонавіч перажываў раскол, які адбыўся на гэтым з'ездзе. Спачатку ён далучыўся да левага крыла БСГ, ідэйнымі кіраўнікамі якога былі Зміцер Жылуновіч і Аляксандр Чарвякоў, а потым стаў членам партыі беларускіх эсэраў, у склад якой уваходзіў да 1924 г.

Ігнат Сымонавіч удзельнічаў у падрыхтоўцы Усебеларускага кангрэса ў Мінску ў снежні 1917 г., на якім яго абралі ў прэзідыум і ваенную секцыю, у рабоце Цэнтральнай беларускай вайсковай рады. На Кангрэсе Дварчанін рыхтаваў газету «Беларуская рада»,

дзе змясціў свае вершы. У ноч на 31 студзеня 1917 г. Усебеларускі кангрэс па рашэнні Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту быў разагнаны ўзброенай сілай, а яго прэзідыум арыштаваны. Сярод арыштаваных аказаўся і Ігнат Дварчанін, але праз тыдзень яго выпусцілі з турмы.

Пасля вызвалення Ігнат Сымонавіч кароткі час працаваў карэспандэнтам у газеце «Вольная Беларусь», дзе былі апублікаваны яго вершы і артыкулы. Менавіта ў гэты час Дварчанін даведаўся аб хваробе бацькі, які як бежанец знаходзіўся са старэйшымі дзецьмі ў Новачаркаску. Таму ў студзені 1918 г. Ігнат дабраўся да Новачаркаска, дзе пражыў да сакавіка 1918 г. Каб пазбегнуць мабілізацыі ў белую гвардыю атамана Каледзіна, ён звольніўся са службы як афіцэр і атрымаў статус бежанца. Хутка Дварчанін стаў працаваць чорнарабочым.

У сакавіку 1918 г. у Новачаркаск увайшлі часці Чырвонай арміі, а 6 красавіка Ігнат Дварчанін атрымаў з Масквы ад камісара Белнацкама Аляксандра Чарвякова тэлеграму наступнага зместу:

*«Навачаркаск. Хамутаўскі 133. Дварчаніну. Белкамісарыят збірае лепшых работнікаў для культурна-асветніцкай працы. Шлём Вам запрашэнне і дакументы на ўезд у Маскву. Абдумайце. Рыхтуйцеся выязджаць. Камісар Чарвякоў»*.

Тэлеграма акрыліла Ігната Сымонавіча, і ён разам з сястрой Вольгай выехаў у Маскву. 24 красавіка 1918 г. ён ужо быў у сталіцы РСФСР, дзе прызначаны сакратаром культурна-асветніцкага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама).

Ацэньваючы дзейнасць Ігната Дварчаніна на гэтай пасадзе, беларускі гісторык Мікалай Бандарэнка адзначаў:

*«На тэрыторыі Савецкай Расіі знаходзілася больш чым 200 вучэбных устаноў, эвакуіраваных Беларусі ў час вайны. Белнацкам збіраў пра іх звесткі для таго, каб школы маглі пачаць сваю работу ў вызваленай Беларусі. Сярод вучняў-беларусаў Белнацкам праводзіў палітычную і культурна-асветную работу. 29 красавіка 1918 года калегія культурна-асветніцкага аддзела Белнацкама ўхваліла падрыхтаваную Ігнатам Дварчанінам адозву "Да вучняў-беларусаў" і пастанавіла надрукаваць яе ў "Дзянніцы", а таксама ў перакладзе на рускую мову ў іншых газетах. У маі адозва была надрукавана ў "Правде", "Известиях", "Дзянніцы"...*

*Вучням прапаноўвалася звяртацца ў культурна-асветны аддзел Белнацкама, ствараць на месцах гурткі і саюзы. Адозва ў "Правде" заканчвалася вершаванымі радкамі на беларускай мове:*

*Вас праца жджэ, народ Вас просіць,*
*Вы, Вы, яго надзея, цвет.*

*...Культурна-асветны аддзел працаваў зладжана і ініцыятыўна. У гэтым нямалая заслуга Ігната як сакратара гэтага аддзела. Узначальваў аддзел Фёдар Турук»*[1].

Па ініцыятыве Ігната Сымонавіча ў Маскве пачаў працаваць Беларускі народны ўніверсітэт-лекторый з чатырма цыкламі: беларусазнаўства, сацыяльна-палітычных навук, агульнапедагагічнымі і прыроданавуковым. Слухачамі БНУ былі настаўнікі пачатковых і сярэдніх школ, а таксама супрацоўнікі Белнацкама. Выпускнікі кароткатэрміновых курсаў пры Беларускім народным універсітэце раз'язджаліся па беларускіх школах Расіі і Беларусі, а многія з іх станавіліся актывістамі Белнацкама. Сярод лектараў БНУ былі вядомы вучоны-славіст, прафесар Уладзімір Пічэта — будучы першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, акадэмік АН СССР і АН БССР; вядомы гісторык, вучоны ў галіне эканамічнай геаграфіі Яўсей Канчар; гісторык адукацыі Антон Ясінскі; таленавіты літаратуразнаўца, будучы кіраўнік урада Савецкай Беларусі Зміцер Жылуновіч.

З імем Дварчаніна звязана нарада настаўнікаў школ Беларусі, якая адбылася 21–23 ліпеня 1918 г. у Маскве. Акрамя настаўнікаў школ, на ёй прысутнічалі прадстаўнікі ўсерасійскіх настаўніцкіх курсаў, слухачы Беларускага народнага ўніверсітэта, настаўнікі — дэлегаты Усерасійскага з'езда бежанцаў Беларусі. Знаёмячыся са спісам удзельнікаў нарады, мы сустракаем прозвішча будучага міністра асветы БССР Платона Саевіча, настаўніка Аляксандра Куляшова — бацькі народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова, таленавітага этнографа і фалькларыста Ісака Сербава.

Адным з цэнтральных пытанняў, разгляданых на нарадзе, было пытанне аб агульным плане арганізацыі справы народнай адукацыі ў Беларусі, па якім дакладчыкамі былі Мазур і Дварчанін. Ігнат

---

[1] Бандарэнка М. Ігнат Дварчанін // Полымя. 2000. № 6. С. 119–121.

Сымонавіч выступіў з дакладам аб задачах школьнай справы на Беларусі. У гэтым дакладзе ён падкрэсліў важнасць і неабходнасць вывучэння беларускай мовы, літаратуры, гісторыі, наогул беларусазнаўства для абуджэння нацыянальнай самасвядомасці і чалавечай годнасці беларускага народа, каб *«народ беларускі пазнаў самаго сябе і лічыў сябе не ніжэйшым пасярод другіх, а чуў сябе як роўны з роўнымі»*[1].

1918 год — гэта год актыўнага супрацоўніцтва Ігната Сымонавіча з газетай «Дзянніца», органам Беларускага нацыянальнага камісарыята. У сувязі з гэтым аўтары гісторыка-біяграфічнага нарыса «І. С. Дварчанін» Я. А. Місарэвіч і М. Д. Каралёў падкрэслілі:

*«"Дзянніца" ў справаздачы аб дакладах Мазура і Дварчаніна адзначыла, што яны як бы дапаўняюць адзін другога. Калі Мазур малюе карціну школьнай справы, якою яна павінна быць на Беларусі ў звязку з агульным будаўніцтвам школы ў Расійскай Сацыялістычнай Рэспубліцы, то Дварчанін засяродзіў увагу на тых асаблівасцях, якія павінны адрозніваць школу як школу беларускую. Што гэта за асаблівасці? "Перш-наперш беларуская справа, гаварыў І. Дварчанін. ёсць справа разам з тым і сацыялістычная. Пад імем беларусаў разумеецца ня ўвесь народ з усімі класамі, а толькі адзін клас працавітай бедноты і сялян, работнікаў. Буржуазія ў нас яўрэйская, памешчыцтва — польскае, чыноўніцтва — вялікарускае...*

*Апроч таго, справа ў тым, што рускі насадзіцельны нацыяналізм, ня маючы прыпынку сярод беларусаў, знайшоў перашкоду сярод польскіх нацыяналістаў, якія цераз касцёлы і школы працавалі над асіміляцыяй беларусаў, але ў польскі бок... Школа беларуская павінна атрымаць аўтаномію, дзе поруч з агульнымі заданнямі сацыялістычнай школы, павінны быць уведзены асобныя прадметы беларускай мовы, літаратуры і наогул беларусазнаўства. Дзеля таго, каб народ беларускі пазнаў самаго сябе і лічыў сябе ня нізшым пасярод другіх, а чуў сябе як роўны з роўнымі".*

*Не без непасрэднага ўдзелу І. С. Дварчаніна рыхтаваліся і былі прыняты рэзалюцыі нарады настаўнікаў. асноўны змест якіх заключаўся ў тым. што беларускаму народу пагражае культурнае і духоўнае здзічэнне, калі неадкладна не будуць прыняты ўсе маг-*

---

[1] Дзянніца. 1918. 26 жн.

*чымыя меры да аднаўлення на новых пачатках школ, разбураных чатырохгадовай імперыялістычнай вайной. Для вырашэння гэтай задачы нарада прызнала: неабходна ў першую чаргу правесці рээвакуацыю навучальных устаноў, хаця б у неакупаванай частцы тэрыторыі Беларусі»*[1].

Мала каму вядома, што па ініцыятыве Ігната Дварчаніна ў Маскве было арганізавана Таварыства беларускіх вучоных. Калі для каардынацыі дзеянняў у межах усёй Савецкай Расіі пры Народным камісарыяце РСФСР па справах нацыянальнасцей утварылася Культурна-асветная камісія з прадстаўнікоў адпаведных аддзелаў, якія прадстаўлялі розныя этнасы Расіі, Ігната Дварчаніна прызначылі пастаянным прадстаўніком ад культурна-асветнага аддзела Белнацкама ў Культурна-асветнай камісіі.

30 ліпеня 1918 г. Ігнат Сымонавіч быў накіраваны ў камандзіроўку ў Оршу *«з даручэннем па справах Беларускага нацыянальнага камісарыяту»* на тэрмін да верасня 1918 г. Аўтарытэтная польская даследчыца Аляксандра Бергман лічыць, што ён паехаў на радзіму ў пошуках маці і сваякоў, якія былі бежанцамі, а вярнуцца ў Маскву ўжо не мог, таму што ваенная сітуацыя ўвесь час змянялася.

У верасні 1921 г. таварыства «Бацькаўшчына» дэлегавала Ігната Дварчаніна ў Прагу на Беларускую нацыянальна-палітычную канферэнцыю. У гэты час ён паступіў у пражскі Карлавы ўніверсітэт, быў старшынёй Аб'яднання прагрэсіўных беларускіх студэнтаў у Празе, членам Беларускай рады, якая аб'ядноўвала беларускую эміграцыю ў Чэхаславакіі, рэдактарам «Бюлетэня аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый».

Ігнат быў рады сустрэчы са старым знаёмым Тамашом Грыбам. Іх лёс звёў яшчэ ў Мінску на Усебеларускім кангрэсе. У Празе яны вучыліся на адным філасофскім факультэце. Крыху пазней сюды прыехаў яшчэ адзін Ігнатаў знаёмы — Уладзімір Жылка, з якім ён таксама пасябраваў у 1917 г. у Мінску.

---

[1] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. Гродна: Гродзенскае абласное аддзяленне Беларускага фонду культуры, 1995. С. 20–21.

Дварчанін у Празе трымаў сувязь з Браніславам Тарашкевічам і другімі будучымі лідарамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), прымаў удзел у левай віленскай прэсе — газетах «Беларускі звон», «Наш шлях». Артыкулы і вершы ён падпісваў сваім прозвішчам. А таксама псеўданімамі: І. Д., Гудок.

За гады вучобы Ігнат Дварчанін авалодаў чэшскай мовай настолькі, што, вярнуўшыся на радзіму, перакладаў на беларускую мову творы класіка чэшскай літаратуры Карэла Чапека.

У 1924 г. Ігнат Сымонавіч стварыў у Празе студэнцкую арганізацыю «Незалежныя сацыялісты». У 1925 г. Дварчанін скончыў філасофскі факультэт Карлава ўніверсітэта ў Празе. Праз год — 16 чэрвеня 1926 г. — у 31-гадовым узросце ў сценах гэтага ўніверсітэта ён абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве» і атрымаў дыплом доктара філасофіі. Гэтая праца з'яўляецца першым у беларускім літаратуразнаўстве даследаваннем аб Францыску Скарыне і выйшла ў Мінску ў перакладзе з чэшскай мовы ў 1991 г.

Вядомы расійскі даследчык кнігі і гісторыі кнігадрукавання прафесар Яўген Неміроўскі ў сваёй кнізе «Па слядах Францыска Скарыны» (Мінск, 1990), ацэньваючы доктарскую дысертацыю Ігната Дварчаніна, падкрэсліваў: *«...Па сутнасці, першая пасля П. У. Уладзімірава, прысвечаная вялікаму беларускаму асветніку. Гэта — тоўсты машынапісны том аб'ёмам у 300 старонак».*

Паўстае пытанне: чым быў выкліканы выбар Дварчаніным тэмы доктарскай дысертацыі? Як бы адказваючы на гэта пытанне, беларускі даследчык Вячаслаў Шалькевіч адзначыў:

*«Гады вучобы Дварчаніна ва ўніверсітэце супалі з падрыхтоўкай і святкаваннем 400-годдзя беларускага кнігадрукавання, якое шырока адзначалася ў многіх славянскіх краінах, у тым ліку і ў Чэхаславакіі, дзе былі выдадзены першыя беларускія кнігі. Гэта падзея паслужыла штуршком для вывучэння Дварчаніным дзейнасці і светапогляду Скарыны».*

Аўтарытэтны беларускі крытык і літаратуразнавец Уладзімір Калеснік у сваім артыкуле «Пражскі эпісталярый» (Полымя. 1990. № 9) адзначыў:

*«Дварчанін задумаў і напісаў не акадэмічную, а публіцыстычную працу з больш высокім, чым дапускалася па этыкеце, каэфіцыентам*

*дыскусійнасці. Малады даследчык глянуў на Скарыну і яго справу вачыма ўдзельніка беларускага вызваленчага руху і пранікліва выявіў глыбінную пераклічку стымулаў, ідэалаў паводзін... Скарына ў разуменні Дварчаніна — гэта вялікі беларускі патрыёт, асветнік і дэмакрат, які жыў інтарэсамі народа і пакутаваў з-за таго, што меў смеласць апярэджваць свой час, зваць у будучыню землякоў, хоць многія з іх не разумелі яго. Дварчанін убачыў трыумф, але і адчуў трагізм вялікага чалавека, трагізм прадвесніцтва».*

На думку аўтара гэтых радкоў, інтарэс Дварчаніна да Скарыны зарадзіўся яшчэ ў 1918 г. у час яго работы ў Белнацкаме. Праз тры гады, у 1921 г. у віленскай газеце «Беларускі звон» быў надрукаваны матэрыял Дварчаніна «З Чэшскага музея», у якім расказвалася пра Біблію Скарыны (1517) і кнігу Пятра Уладзімірава «Доктор Франциск Скорина» (1888), якія захоўваюцца ў музеі. У той жа час нельга не пагадзіцца з Уладзімірам Калеснікам, які сцвярджаў, што Дварчанін разглядаў свой твор як духоўны стымулятар адраджэння ў беларускім народзе загубленай нацыянальнай памяці.

Жывучы ў Празе, Ігнат Сымонавіч, натуральна, паспрабаваў адшукаць дакументы аб Скарыне ў мясцовых архівасховішчах. Але тут яго поспехі былі больш чым сціплыя. У метрычных кнігах Пражскага ўніверсітэта за XV — першую палову XVI ст. Дварчанін выявіў спісы студэнтаў, завяршыўшых адукацыю на факультэце свабодных мастацтваў. З гэтых спісаў ён вылучыў імёны 33 студэнтаў, якія паходзілі з Вялікага Княства Літоўскага. Сярод іх Іван, Мацвей і Пётр з Полацка і, што асабліва цікава, Францыск з Літвы. На жаль, Дварчанін не ўказвае, калі менавіта гэты Францыск вучыўся ў Празе. Таму цяжка сказаць, ці ідзе гаворка аб вялікім беларускім асветніку, ці аб нейкім іншым чалавеку[1].

Ва ўступе да сваёй дысертацыі Дварчанін адзначаў:

*«Спробы знайсці якія-небудзь прыкметы з жыцця і дзейнасці Скарыны, паколькі ў значнай ступені яны звязаны з Прагай, у архівах Нацыянальнага музея, міністэрства ўнутраных спраў, Гарадского музея... не далі жаданых вынікаў...*

---

[1] Дварчанін І. Беларусы на Праскім універсытэце ад ягоных закладзінаў да паловы XVI стагодзьдзья // Запісы БІНіМ. Нью-Ёрк. 1953. № 2 (4). С. 65–69.

*Зыходзячы з гэтага, падставай нашай працы будуць паасобныя даследаванні вучоных, якія мелі ў сваім карыстанні першакрыніцы... »*[1].

Вызначаючы мэты сваёй дысертацыі, Дварчанін падкрэсліваў, што ён хоча разгледзець дзейнасць Скарыны не толькі ў сувязі з культурным становішчам Айчыны, але і ў кантэксце з заходнееўрапейскім. Дысертацыя ставіла сваёй мэтай даследаваць светапогляд Скарыны, не засяроджваючыся на знешніх асаблівасцях яго прац, апісанні і параўнанні тэкстаў.

Такім чынам, заключаў Ігнат Сымонавіч, тэма «Францыск Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве» дазволіць расказаць пра Скарыну як чалавека, пісьменніка. кнігадрукара, гуманіста ўвогуле і нацыянальнага дзеяча (месца яго ў сучасным грамадстве, уплыў і значэнне).

На наш погляд, адзін з самых цікавых раздзелаў дысертацыі Дварчаніна (усяго іх дзевяць) — «Стымулы дзейнасці Францішка Скарыны. Скарына як чалавек». Аўтар выдзеліў чатыры галоўныя моманты: матэрыяльны інтарэс, рэлігійнае падзвіжніцтва, дасягненні айчыннай культуры і ўплыў замежнай культуры. Наконт першага могуць узнікнуць пытанні. Аднак Ігнат Дварчанін правамерна лічыў, што матэрыяльныя інтарэсы для Скарыны не стаялі на апошнім месцы. Пра гэта сведчыла і тое, што свае кнігі ён друкаваў у памеры, зручным для продажу, а «Малую падарожную кніжку» наогул прызначыў для купцоў, якія адпраўляліся ў раз'езды.

Таксама з цікавасцю чытаецца раздзел «Скарына як пісьменнік». Вучоны пытаўся: а ці можна наогул лічыць Скарыну пісьменнікам? І на падставе аналізу самасвядомасці першадрукара, яго свецкіх поглядаў, патрыятызму і дэмакратызму, любві да роднай мовы станоўча адказаў на пастаўленае пытанне. Можна смела сцвярджаць, што да Ігната Дварчаніна ніводзін вучоны так аргументавана не паказваў Скарыну як гуманіста.

Характарызуючы дзейнасць беларускага першадрукара, даследчык прыйшоў да высновы, што той меў уплыў на цэлую культурную эпоху, пачатак якой быў пакладзены у XVI ст., і не толькі на

[1] Дварчанін І. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. Мінск, 1991. С. 9–10.

Беларусь і Украіну, дзейнасць яго была заўважана і па-за іх межамі: і ў Маскоўскай Русі, і ў палякаў, славенцаў, балгар. Дварчанін разглядаў Скарыну як нейкае сувязное звяно славянскіх культур. (Дарэчы, бібліяграфія друкаваных крыніц па тэме дысертацыі склала 190 назваў.)

Трэба адзначыць, што некаторыя высновы даследчыка, упершыню зробленыя ў дысертацыі, былі апублікаваны асобнымі артыкуламі. Так, у выданні «Родныя гоні» (Вільня, 1927. Кн. 1) быў надрукаваны артыкул Ігната Дварчаніна «Аб годзе нараджэння Фр. Скарыны». У гэтай рабоце вучоны падтрымаў гіпотэзу Міколы Шчакаціхіна, паводле якой датай нараджэння Скарыны трэба лічыць 6 сакавіка 1486 г. (у дысертацыі называюцца 80-я гг. XV ст. і 1487 г.).

Ігнат Дварчанін уступіў у Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, быў цесна звязаны з яе кіраўніцтвам, выконваў даручэнні Цэнтральнага сакратарыята БСРГ, вёў лекцыі ў Віленскім гуртку Грамады.

Эрудыцыя, веданне мовы і літаратуры, журналісцкі вопыт спрыялі таму, што ў хуткім часе Дварчанін стаў сакратаром і віцэ-старшынёй Беларускага выдавецкага таварыства.

21 сакавіка 1927 г. Грамада была афіцыйна забаронена і перастала існаваць як арганізацыя. Пасля разгрому і арышту кіраўшкоў БСРГ (Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага і іншых) Ігнат Дварчанін стаў адной з цэнтральных фігураў нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі.

На выбарах у польскі сейм 4 сакавіка 1928 г. у Заходняй Беларусі за кандыдатаў ад рабочых і сялян было пададзена 328,8 тысяч, або 26 %, галасоў. Абраныя па гэтых спісах дэпутаты Я. Гаўрылік, І. Дварчанін (ад Наваградскай выбарчай акругі), Ф. Валынец, І. Грэцкі, П. Крынчык утварылі ў сейме радыкальную фракцыю — Беларускі сялянска-рабочы пасольскі клуб «Змаганне». Праз некаторы час клуб аб'яднаў вакол сябе некалькі соцень чалавек з былога актыву Грамады. У 1929 г. былі створаны 16 павятовых сакратарыятаў клуба.

Поўная назва «Змагання» — «Беларуская дэпутацкая фракцыя "Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых"», якая стала легальнай

рэвалюцыйна-дэмакратычнай і нацыянальна-вызваленчай арганізацыяй працоўных Заходняй Беларусі ў снежні 1927 — жніўні 1930 г. «Змаганне» выдавала газеты нацыянальна-вызваленчага напрамку: «Змаганне», «На варце», «Світанне», «Да працы», «Голас працы».

Клуб «Змаганне» ператварыўся ў рэвалюцыйна-дэмакратычную і нацыянальна-вызваленчую арганізацыю, але ўлады не дазволілі ёй стаць масавай. Як і Грамада, ён патрабаваў канфіскацыі памешчыцкіх зямель і падзелу іх без выкупу сярод беззямельных і малазямельных сялян, 8-гадзіннага рабочага дня і паляпшэння ўмоў працы рабочых, пераходу у іх рукі прамысловых прадпрыемстваў, перакладання падаткаў на маёмасныя класы, стварэння рабоча-сялянскага ўраду, дэмакратычных свабод, нацыянальных правоў, школ на роднай мове, выступаў за самавызначэнне Заходняй Беларусі і ўз'яднанне з БССР[1].

Клуб «Змаганне» ўзначальваў Язэп Гаўрылік, а яго намеснікам быў Ігнат Дварчанін. Ад ЦК КПЗБ дзейнасць гэта клуба накіроўваў Георгі Муха-Мухноўскі. Былы інструктар пасольскага клуба «Змагання» Аляксандр Шыдлоўскі успамінаў:

*«У 1930 г. паехаў у Вільню і пачаў там працаваць інструктарам пасольскага клуба "Змаганне"...*

*Сярод паслоў клуба "Змаганне" асабліва выдзяляўся Ігнат Дварчанін сваёй інтэлігентнасцю, эрудыцыяй, навуковым і палітычным кругаглядам. Гэта быў беларускі народнік, асветнік, гуманіст. Ён знаў цану навуцы і пагэтаму сам, як мог, садзейнічаў і заклікаў моладзь вучыцца, каб як мага больш было свядомай беларускай інтэлігенцыі, якая, у сваю чаргу, нясла веды ў народныя масы. Ідэйным кіраўніком клуба "Змаганне" быў Ігнат Дварчанін і ён, як член Галоўнай управы ТБШ, узначаліў упартую барацьбу за беларускія школы. Гэта барацьба вялася па гарадах, Мястэчках і вёсках Заходняй Беларусі. Утвараліся бацькоўскія камітэты, арганізоўваўся масавы збор подпісаў з дамаганнем адкрыцця беларускіх школ»*[2].

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 242. Воп. 1. Спр. 156. Арк. 116–118.

[2] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. С. 272–274.

Актыўная ўдзельніца рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, вядомы польскі вучоны-гісторык Аляксандра Бергман у сваёй кнізе «Беларускія справы ў II Рэчы Паспалітай» (Варшава, 1984) падкрэсліла, што *«так як Тарашкевіч (кіраўнік Грамады — Э. І.) быў самым папулярным сярод рэвалюцыйных паслоў у сейме першага склікання (снежань 1922 — сакавік 1928 года), Ігнат Дварчанін стаў найбольш вядомы па землях Заходняй Беларусі і на Беласточчыне з другога склікання сейма (май 1928 — жнівень 1930 года)».*

Сведка тых памятных дзён, жыхар г. п. Казлоўшчына М. Манулік нагадваў:

*«...А 31 мая 1928 года з трыбуны сойма Дварчанін абвясціў праграмную дэкларацыю беларускага пасольскага клуба "Змаганне за інтарэсы рабочых і сялян".*

*У гэтай дэкларацыі гаварылася: "Клуб «Змаганне» выступае супраць нацыянальнага прыгнёту, за поўнае самавызваленне прыгнечаных народаў, супраць паланізацыі, за агульную дзяржаўную асвету для дзяцей працоўных мас, за адзіную свецкую школу на роднай мове, за зямлю без выкупу для сялян, за поўную свабоду друку, слова, сходаў і арганізацый рабочых, прыгнечаных нацыянальнасцяў, за брацкае супрацоўніцтва народаў".*

*Як народны выбраннік пасол сейма І. Дварчанін праявіў актыўнасць у барацьбе за правы народа, выкладзеныя ў дэкларацыі пасольскага клуба "Змаганне". Ён часта сустракаўся з народам, бываў у шматлікіх мясцінах Прынёманскага краю, заклікаў сялян і рабочых на барацьбу за волю»*[1].

Да сённяшняга часу не страціў сваёй каштоўнасці артыкул Ігната Дварчаніна у альманаху «Беларуская Сялянска-Рабочая Грамада» пад назвай «"Змаганьне" — паслядоўнік "Грамады"». Ён складаўся з шасці раздзелаў:

*«I. Нацыянальна-вызваленчы рух беспасрэдна пасьля разгрому "Грамады".*

*II. Змаганьне і яго шлях.*

*III. Умовы працы "Змаганьня"*

*IV. "Змаганьне" ў сваёй дзейнасці. Барацьба з нац. фашызмам*

---

[1] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. С. 283–284.

*V. Дзейнасць Клюбу "Змаганьне" ў цэлым. Галоўныя кампаніі. VI. Заключныя вывады».*

Ігнат Дварчанін пачаў друкавапца ў 1917 г. У тым самым годзе былі надрукаваны яго вершы «Пільная справа» (Вольная Беларусь. 8 жніўня 1917), «Покліч» (Вольная Беларусь. 8 лістапада 1917) «Да беларусаў-інтэлігентаў» (Беларуская рада. 16 декабря 1917).

Нельга без хвалявання чытаць верш «Покліч», дзе ўзнімаецца праблема павышэння нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, прыцягнення іх да стварэння беларускай дзяржаўнасці. Не забудзем, што ён быў напісаны ў перыяд найвышэйшага рэвалюцыйнага ўздыму ў 1917 г. Ігнат Сымонавіч вельмі перажываў, што беларуская інтэлігенцыя адышла ад народа. Ён заклікаў яе разам з народам будаваць новае жыццё. Аб гэтым сведчыць адзін з самых вядомых вершаў паэта «Да беларусаў-інтэлігентаў».

Шкада, што сённяшнім школьнікам Беларусі невядомы верш Ігната Дварчаніна «Мусі трэба так», напісаны ў 1918 г. Прывяду толькі некалькі радкоў гэтага верша:

*Беларус, ты цёмны!*
*Гэта знае ўсяк!*
*Пяе гора ў комні —*
*Муся трэба так?*

*...Ці ж панам краіны*
*Сам ня можаш стаць*
*І сваёй судзьбінай*
*Цвёрда валодаць?*

Вершы Дварчаніна змяшчаліся у газеце «Дзянніца», часопісах «Родныя гоні», «Маланка», «Наш шлях», «Маладое жыццё», «Беларуская школа ў Латвіі» і іншых. У сваёй паэзіі Ігнат Сымонавіч адлюстроўваў тэмы барацьбы за адраджэнне беларускай культуры, узняцця яе на больш якасны ўзровень, усведамлення беларускім народам сваёй гістарычнай і палітычнай значнасці, роўнасці з іншымі народамі.

Пад назвай свайго верша «Студэнт» (1921) Ігнат Сымонавіч напісаў: *«Ахвярую пражскім і віленскім калегам».* Праз увесь верш чырвонай ніткай праходзіць думка, што атрыманне ведаў — гэта цяжкая праца, але гэта робіцца не толькі для сябе, а для ўсяго беларускага народа.

Беларускі пісьменнік Якуб Міско адзначаў:

*«На чужыне Дварчанін пасябраваў з групай беларускіх паэтаў, сярод якіх асабліваe месца займаў Уладзімір Жылка. У Празе існавала аб'яднанне беларускіх прагрэсіўных студэнтаў. Яго старшынёй быў выбраны Дварчанін. Аб'яднанне выдавала рукапісны часопіс «Перавясла». У ім змяшчаў свае творы і Дварчанін. У адным з вершаў, напісаным у 1924 годзе, ён гаварыў:*

*Я — работнік, сваёю мазольнай рукой*
*Увесь велізарны свет накарміў і адзеў.*
*Па абліччы зямлі, як магутнай ракой,*
*Разнясла мая сіла жыццёвасці спеў.*

*Нягледзячы на пэўную рытарычнасць і абстрактнасць гэтых і іншых радкоў верша, у іх адчуваецца вера ў святую справу працоўнага люду»*[1].

У беларускага літаратуразнаўцы Ірыны Багдановіч былі ўсе падставы да высновы, што вострае адчуванне Дварчанінам драматызму становішча свайго народа, які вякамі цярпеў сацыяльную і нацыянальную несправядлівасць (вершы «З новым годам», «Дзівак», «Безработны», «Маўчы» і інш.), спалучаецца ў яго творах з рамантычнымі матывамі асветы і асветніцтва як выйсця з нядолі («Брату-вучыцелю», «Да беларусаў-інтэлігентаў», «Студэнт»), з узнёслымі лірычнымі настроямі, спробамі медытацый («Вечнасць», «Ля мора»).

Варта прывесці радкі з яго верша «Брату-вучыцелю»:

*Не бойся, мой брат, не загінуць зярняты,*
*Што ўкінеш ты вернай рукой.*
*Як дар яны з неба там будуць прыняты*
*Даўно ўгатаванай раллёй.*

Нізка вершаў Дварчаніна апублікавана ў калектыўным зборніку «Ростані волі. З заходнебеларускай паэзіі» (1990), складальнікам якога быў вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Калеснік.

Ігнат Сымонавіч быў таленавітым літаратуразнаўцам. Ён склаў і ў 1927 г. выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры» (ад 1905 года)» (для старэйшых класаў беларускіх сярэдніх

[1] Міско Я. Маё маўклівае сэрца: з літ. спадчыны. Мінск: Юнацтва, 1983. С. 447–448.

школ), у якой былі змешчаны творы беларускіх пісьменнікаў, дадзены кароткія каментарыі пра іх жыццёвы і творчы шлях. Гэтае выданне адыграла вялікую ролю ў школьным навучанні і патрыятычным выхаванні моладзі Заходняй Беларусі, стала падзеяй у грамадска-культурным жыцці гэтага рэгіёна. У сваёй хрэстаматыі Дварчанін змясціў партрэт Янкі Купалы, яго кароткую біяграфію і 33 вершы («Мужык», «А хто там ідзе?», «Песня вольнага чалавека», «Гусляр», «Прарок», «Песня званара», «Ворагам Беларушчыны», «Гэй, капайце, далакопы», «Цару неба й зямлі» і інш.), паэмы «Курган», «На куццю», «Яна і я», «Безназоўнае». «На папасе», урыўкі з камедыі «Паўлінка». Умела падабраныя творы Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых беларускіх пісьменнікаў, прасякнутыя патрыятычнымі пачуццямі, ва ўмовах санацыйнай Польшчы будзілі нацыянальную самасвядомасць працоўных Заходняй Беларусі, клікалі да барацьбы за вызваленне з-пад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Дварчанін паставіў Я. Коласа поруч з лепшымі сусветнымі пісьменнікамі як «маляра прыроды», вылучыў яго ўменне быць глыбокім псіхолагам, «душаведам» (*«выведзеныя ім беларускія тыпы здзіўляюць нас псыхолёгічнай праўдзівасьцю»*).

Шмат цікавага змешчана ў тэзісах даклада «Ігнат Дварчанін як вучоны-літаратуразнавец», з якім выступіла на Шостых рэспубліканскіх Калеснікаўскіх чытаннях 26 кастрычніка 2007 г. у Брэсце беларуская даследчыца К. М. Мароз. Яна адзначыла:

*«Праца выкладчыкам літаратуры. а таксама ў ТБШ, дапамагла І. Дварчаніну выявіць вострую неабходнасць у падручніках (адзінымі былі "Гісторыя" і "Хрэстаматыя" М. Гарэцкага). Гэта стала стымулам для складання ім "Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)", якая была выдадзена ў 1927 годзе... Храналагічна ён працягваў "Хрэстаматыю" М. Гарэцкага (1922 г.), які абмежаваўся перыядам да 1905 года... Цікава. што да існуючай "Гісторыі" сваю хрэстаматыю аўтар не прыстасоўваў. Таму зразумелай становіцца структура падачы матэрыялу па кожным пісьменніку: творчы партрэт з крытычнымі каментарамі і далей — урыўкі з лепшых твораў ці іх пераказ. Так ствараласяя ўражанне аб цэласным вобліку мастака, пры гэтым захоўвалася самастойная пазіцыя аўтара-складальніка як літаратуразнаўцы. Храналагічны ж прынцып лёгка касуецца ў карысць класавага пры-*

*нцыпу, усе мастакі слова дзеляцца на пісьменнікаў "пераходнага часу", сялянскіх, пралетарскіх, з інтэлігенцыі, мяшчанства і з "рэлігійным нахілам". Зразумела, што такі падзел быў зроблены па прычыне сімпатыі і арыентацыі Дварчаніна на савецкую афіцыйную крытыку, якая прапагандавала прынцып партыйнасці, класавасці, у прыватнасці, пралеткультаўскую тэорыю сацыяльнага паходжання (Ц. Гартны, М. Байкоў, М. Піятуховіч), а пасля і БелАППаўцы дзялілі ўсіх на сялянскіх, пралетарскіх, папутнікаў буржуазных). Аднак І. Дварчанін і больш інтэлігентна стрыманы, і больш глыбокі і самастойны ў сваіх поглядах... класавы прынцып не спрацоўвае і пры аналізе творчасці наступнай групы — пісьменнікаў з "інтэлігенцыі", да якіх аўтар залічвае М. Багдановіча, М. Гарэцкага, К. Сваяка... Нягледзячы на метадалагічныя выдаткі, "Хрэстаматыя" Дварчаніна адлюстравала даволі поўна тагачасны літаратурны працэс у асобных постацях і творах, што засведчыла пра дэмакратызм поглядаў аўтара, яго ўменне вылучыць сучаснае, адметнае ў творчым абліччы мастакоў слова. І сёння яна можа чытацца з цікавасцю, таму што пэўныя ацэнкі не страцілі свайго значэння»*[1].

Адна з прац Ігната Дварчаніна, прысвечана творчасці Максіма Багдановіча і рэкамендавана лектарам правінцыйных асветных гурткоў у якасці лекцыі. Гэта была і даніна памяці паэту у сувязі з 10-годдзем яго смерці[2].

Ігнат Сымонавіч падае Максіма Багдановіча як паэта высокай культуры, адукаванасці, які *«свядома ўжываў усе магчымыя формы сусветнай паэзіі»* на беларускай мове. Вельмі важна, што Дварчанін акцэнтуе сваю ўвагу на разнастайных праявах гармоніі формы і зместу ў вершах паэта. Ён падзяляе погляд беларускага літаратуразнаўцы Міхаіла Піятуховіча, ацэньваючы Багдановіча як філосафа і паэта-імпрэсіяніста.

Ігнат Дварчанін праявіў сябе таленавітым публіцыстам. У час яго працы ў культурна-асветным аддзеле Белнацкама ў Маскве ў

[1] Мароз К. М. Ігнат Дварчанін як вучоны-літатуразнавец // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні. Брэст: Альтэрнатыва, 2008. С. 83–85.

[2] Дварчанін І. Максім Багдановіч. Жыццё і творства // Родныя гоні. 1927. № 2. С. 8–10.

1918 г., калі аддзел паставіў перад сабой задачу знайсці настаўнікаў і выкладчыкаў пачатковых школ, што эвакуяваліся ў Расію, і вярнуць іх у Беларусь для работы па спецыяльнасці, Дварчаніну даручылі скласці зварот да настаўнікаў-беларусаў і надрукаваць яго ў газетах. Праз два дні тэкст быў прадстаўлены на зацвярджэнне ў аддзеле. Яго ўхвалілі і ён быў надрукаваны ў «Правде», «Известнях» і органе Белнацкама «Дзянніцы». У тэксце, змешчаным у «Правде», адзначалася: *«Нямецкія войскі занялі нашу краіну. І зноў буржуазія села на карак большасці нашых братоў. Нас разбілі, пакінулі на свабодзе меншую частку. Але не трэба адчайвацца, трэба з энергіяй узяцца за работу па наладжванню новага жыцця».*

У многіх нумарах газеты «Дзянніца» публікаваліся артыкулы Ігната Дварчаніна.

Праз пяць гадоў левадэмакратычныя нацыянальныя сілы ў Празе Уладзімір Жылка, Ігнат Дварчанін і Тамаш Грыб заснавалі ў Празе часопіс «Перавясла». На думку беларускай даследчыцы М. І. Чмаравай, часопіс не ўтойваў сваёй палітычнай арыентацыі і дэкляраваўся стаць выказнікам той часткі беларускага студэнцтва ў Празе, *«якая адмовілася бачыць у беларускім руху дзяржаўны рух Беларуска-Літоўскага княства, ці то зараджэньня аднэй толькі мовы, якая ў руху бачыць адбітак выступу на сцэну грамадскага жыцця беларускіх працоўных грамад і ўважае шкодным... "расплыўчатасць", усеагульнасць, пазаклясавасць... Паступова студэнцтва, выдаючы часопіс, уважае, што беларускі нацыянальны рух есьць разам з тым клясавы рух, рух беларускіх сялян і работнікаў, сябе лічыць за неаддзельную частку»*[1].

Часцей за ўсё з публіцыстычнымі артыкуламі ў гэтым часопісе выступалі Тамаш Грыб, Вінцэнт Грышкевіч, Ігнат Дварчанін. У часопісе «Перавясла» была таксама змешчана рэцэнзія Дварчаніна на вучнёўскі часопіс Люцінкаўскай беларускай гімназіі «Ластаўка». Яна сведчыла аб сур'ёзнай цікавасці рэцэнзента да ўсеагульнага беларускага літаратурнага працэсу, аб жаданні быць далучаным да яго.

---

[1] Чмарава М. І. Шляхі ўзаемнага пазнання: беларуская літаратура ў Чэхаславакіі (1920–1945). Магілёў: УА «Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова», 2004. С. 1.

У 1926 г. пад псеўданімам «І. Гудок» Ігнат Сымонавіч пераклаў на беларускую мову паэму Аляксандра Блока «Дванаццаць». Гэты пераклад быў апублікаваны ў 15-м нумары «Маланкі» за 1926 г.

Ацэньваючы творчую спадчыну Ігната Дварчаніна, знакаміты беларускі літаратуразнавец Арсень Ліс падкрэсліў:

*«Прыкметнай і даволі перспектыўнай ў літаратурным жыцці Заходняй Беларусі 1920-х гадоў выглядала літаратуразнаўчая праца Ігната Дварчаніна (1895–1937). Вярнуўшыся ў 1926 г. пасля заканчэння Пражскага ўніверсітэта і абароны доктарскай дысертацыі на тэму дзейнасці Ф. Скарыны ў Вільню, Дварчанін актыўна ўключыўся ў культурна-грамадскае жыццё. У 1927 г. ён актыўна выступіў з некалькімі публікацыямі, у тым ліку з артыкулам пра паэтыку М. Багдановіча, узяў удзел у публічнай дыскусіі наконт года нараджэння Скарыны. Вынікам літаратуразнаўча-асветніцкай працы Дварчаніна з'явілася падрыхтаваная ім "Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры", якая, дзякуючы ўключэнню ў яе ўзораў беларускага мастацкага слова першай чвэрці XX ст., адыграла выдатную этнаахоўную, патрыятычна-выхаваўчую ролю ў Заходняй Беларусі. Абапіраючыся на сацыялагічна-псіхалагічны крытэр, малады літаратуразнавец стварыў даволі арыгінальную класіфікацыю беларускай літаратуры новага часу, даў змястоўныя дэфініцыі творчасці асобных яе прадстаўнікоў»*[1].

На вялікі жаль, «белай плямай» у даследаванні біяграфіі Ігната Сымонавіча з'яўляецца тэма «Дварчанін як настаўнік, выкладчык і педагог». Калі ён воляй лёсу ў жніўні 1918 г. вымушаны быў застацца ў роднай вёсцы Погіры, то адкрыў пачатковую школу ў суседняй вёсцы Пяцюкі. За кароткі час Ігната Сымонавіча палюбілі не толькі дзеці, але і іх бацькі. Жыць было цяжка, таму што заработную плату ніхто не плаціў. І ўдзячныя бацькі вучняў і іншыя вяскоўцы стараліся чым-кольвечы дапамагчы самаахвярнаму настаўніку: нехта пакіне ў калідоры глячок малака, акраец хлеба, таму што вяскоўцы ведалі, што так настаўнік браць ад іх не будзе. І Дварчанін з удзячнасцю ў душы адклікаўся аб гэтых сардэчных людзях, звыкся з імі. Ён імкнуўся перадаць свае веды вучням, стараўся выхаваць любоў да роднага беларускага слова. Але папрацаваць настаўнікам у

[1] Ліс А. Gloria victis: Збор твораў. Мінск: ІП Логвінаў, 2010. С. 258.

Пяцюках Ігнату Сымонавічу прыйшлося нядоўга, таму што вясной 1919 г. Дзятлаўшычу захапілі польскія войскі.

Спачатку Дварчанін працягваў працаваць у школе, але летам 1919 г. яго паслалі на настаўніцкія курсы ў мястэчка Дзятлава. Гэтыя курсы ставілі мэтай падрыхтаваць настаўнікаў польскай мовы. Як свядомы беларус Ігнат Сымонавіч не мог згадзіцца, што пачаўся наступ на беларускую мову, і павёў агітацыю сярод курсантаў, каб усяляк супрацьстаяць наступу паланізацыі. Адначасова ён падпольна стварыў беларускія курсы, драматычны гурток і беларускі хор. Даведаўшыся аб гэтым, польскія ўлады арыштавалі Дварчаніна, разагналі створаныя ім курсы і гурток. Хутка настаўніка-бунтара аправілі ў канцэнтрацыйны лагер у Беластоку. Але яму ўдалося збегчы адтуль.

Ад жніўня 1920 па ліпень 1921 г. Ігнат Дварчанін жыў у Вільні, дзе працаваў настаўнікам, пісарам беларускага аддзела ў Дэпартаменце асветы, а потым быў настаўнікам у мястэчку Свір Свянцянскага павета. Будучы вольным слухачом выпускнога класа, ён летам 1921 г. экстэрнам здаў экзамены за курс Віленскай беларускай гімназіі. І тады Беларускі нацыянальны камітэт накіраваў Дварчаніна ў Дзвінск (цяпер Даўгаўпілс) для выкладання беларусазнаўства на настаўніцкіх курсах.

У 1926 г. Ігнат Дварчанін вярнуўся з Прагі ў Вільню і стаў выкладаць беларускую літаратуру ў Віленскай беларускай гімназіі. Праз шмат гадоў адзін з яго гімназістаў Якуб Міско, які потым стаў відным дзеячам Кампартыі Беларусі і беларускім пісьменнікам, нагадваў:

*«Мы, вучні, неяк адразу адчулі прыхільнасць да гэтага чалавека. Ён не проста выкладаў нам беларускую літаратуру, а стараўся, каб мы і разумелі яе, і любілі. Успамінаецца, як аднойчы ў сёмым класе разбіралася паэма "Сымон-музыка". Вучні гаварылі пра змест твора, пра яго ідэю, характарызавалі галоўных герояў. Дварчанін уважліва слухаў, а пасля падвёў вынікі. "Усё гэта добра, хлопцы, — гаварыў ён. — Я бачу, што вы нядрэнна засвоілі ўрок. Толькі мне здаецца, «Сымона-музыку» трэба і разумець, і сэрцам адчуваць. Гэта жамчужына нашай літаратуры. Тут кожны радок як быццам бруіцца, струменіць. Вы толькі паслухайце:*

*Восень ткала ўжо красёнцы*
*Мяккай чырвані ў лістах*
*Восень спеў вяла бясконцы.*
*З ветрам ходзячы ў кустах;*
*Восень ткала кужаль тонкі —*
*Павуціння белы лён,*
*Восень шэрыя заслонкі*
*Моўчкі клала на адхон.*

*Адчуваеце? — пытаўся Дварчанін. — Колькі тут любасці, замілавання да нашай прыроды, да восені, да нашай зямлі!"*

*Мне здаецца, што вось так кожны яго ўрок станавіўся ўрокам любові да літаратуры. да свайго народа, урокам добрых чалавечых пачуццяў»*[1].

Усё жыццё памятаў аб уроках Ігната Дварчаніна беларускі паэт Анатоль Іверс:

*«Даволі падрыхтаваным чатырнаццацігадовым хлопцам я паступіў у трэці клас Віленскай беларускай гімназіі, што адпавядала пятаму класу цяперашняй сярэдняй школы...*

*Самымі любімымі прадметамі былі беларуская мова і беларуская літаратура. Найбольшым аўтарытэтам у вучняў карыстаўся выкладчык гэтых прадметаў Ігнат Сямёнавіч Дварчанін. Яго ўрокі заўсёды праходзілі цікава. Настаўнік не стараўся прытрымлівацца рамкаў падручніка, расказваў шырэй, прыводзіў шмат цікавых прыкладаў з літаратуры і жыцця пісьменнікаў. Я не помню, каб ён калі разззлаваў або каго пакараў. Усе вучні выдатна ведалі тое, аб чым гаварылася ў класе і што задавалася на дом. Амаль у кожнага настаўніка была мянушка, толькі ніякая мянушка не прыставала да Ігната Сямёнавіча.*

*Дварчанін любіў, разумеў дзяцей, не патрабаваў сляпога паслушэння. І таму дысцыпліна ў класе была не палачная, а вясёлая, я б сказаў, дэмакратычная. Дзяжурствы выконваліся акуратна. Усе адчувалі сябе свабодна»*[2].

Былы гімназіст Ігната Дварчаніна М. Макулік з г. п. Казлоўшчына адзначаў:

---

[1] Міско Я. Маё маўклівае сэрца. С. 448–449.

[2] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. С. 285–286.

*«Ігнат Дварчанін адразу здабыў сабе вялікі аўтарытэт сярод навучэнцаў і работнікаў гімназіі. Яго заняткі ў класах успрымаліся навучэнцамі як чыстыя крыніцы ведаў беларускай мовы, літаратуры.*

*Ігнат Сямёнавіч часта выступаў з лекцыямі, арганізоўваў літаратурныя вечары для гімназістаў і работнікаў гімназіі. Асабліва было цікава яго слухаць аб вытоках беларускай пісьмовасці, літаратуры ад часоў Францыска Скарыны да сучаснасці.*

*Некалькі разоў ён вечарамі прыходзіў да нас у інтэрнат, каб пагутарыць з намі. Яго меладычная шчырая мова нас захапляла. Мы атрымоўвалі адказы на ўсе пытанні, звязаныя з нацыянальнай свядомасцю, сацыяльным жыццём, культурай нашага шматпакутнага народа»*[1].

У 1930 г. Дварчанін быў арыштаваны польскімі ўладамі і асуджаны на 8 год турмы. У выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай у 1932 г. ён прыехаў у Мінск. Ігнат Дварчанін быў накіраваны ў Беларускую акадэмію навук, у Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі. Гэтая праца задавальняла яго, таму што ён добра ведаў эканамічнае і сацыяльнае становішча. У ліпені 1933 г. Дварчаніна накіравалі выконваць абавязкі дырэктара Інстытута мовазнаўства БАН. Беларускія даследчыкі Я. А. Місарэвіч і М. Д. Каралёў адзначылі:

*«Неабходна было завяршыць рад важнейшых работ па правапісу, складанню беларускага слоўніка, тэрміналогіі. Усё гэта прадстаяла зрабіць за кароткі час. Дварчанін разумеў, наколькі складаная прадстаіць праца і размеркаваў навуковыя сілы інстытута так, каб усе напрамкі былі ім ахоплены. Асабліва складаная работа была над слоўнікам. Хоць і былі якія-ніякія напрацоўкі, іх трэба было сістэматызаваць і напоўніць. Меркавалася выпусціць слоўнік на 50 тысяч слоў. За кароткі тэрмін падрыхтавалі амаль тры тамы рукапіснага тэксту па тэрміналогіі і правапісу.*

*Але радасць і глыток волі былі нядоўгімі. Беларускі слоўнік і распрацаваная пад кіраўніцтвам Дварчаніна методыка па тэрміналогіі і правапісу не ўбачылі свет. Дарэчы новы беларускі слоўнік*

---

[1] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. С. 283.

*быў складзены і выдадзены ажно пасля Вялікай Айчыннай вайны пад рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі»*[1].

16 жніўня 1933 г. Дварчанін быў арыштаваны па справе «Беларускага нацыянальнага цэнтра» (БНЦ), які нібыта дзейнічаў на карысць буржуазнай Польшчы. У Цэнтральным архіве КДБ Рэспублікі Беларусь захоўваюцца дакументы аб «выкрыцці» і ліквідацыі Паўнамоцным прадстаўніцтвам АДПУ па БССР *«шырокаразгалінаванай контррэвалюцыйнай паўстанцкай і шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі "Беларускі нацыянальны цэнтр" і яе філіялаў Горках і Беразіно»*. Гэтая 55-томная справа № 233771 сфальсіфікавана ў лепшых традыцыях дэтэктыўнага жанру, з вялікім размахам і шырокай геаграфіяй ахопу, яна распаўсюджвалася на *«значную частку тэрыторыі Беларускай ССР з філіяламі ў гарадах Маскве і Ленінградзе»*. Усяго былі арыштаваны 281 чалавек, у тым ліку 77 у Мінску і 204 «на месцах».

БНЦ быццам бы стварылі ў верасні 1932 г. Максім Бурсевіч, Павел Валошын, Флягонт Валынец, Язэп Гаўрылік, Ігнат Дварчанін, Пятро Мятла, Сымон Рак-Міхайлоўскі — беларускія палітэмігранты, якія прыбылі ў БССР з Польшчы ў красавіку 1930 і верасні 1932 г. Асобы цынізм гэтай «справы» заключаўся ў тым. што тыя яго фігуранты, якія прыехалі з Польшчы, былі арыштаваны даволі хутка пасля прыезду ў Мінск і ўтрымліваліся пад вартай да пачатку працэсу. Гэта значыць, што яны не мелі фізічнай магчымасці займацца на тэрыторыі Беларусі грамадска-палітычнай дзейнасцю.

Як гэта ні горка і балюча ўсведамляць, але адным з першых абвінавачаных, якога ўдалося «зламаць» чэкістам, быў Ігнат Дварчанін. Ужо на другі дзень пасля арышту ён напісаў у Калегію АДПУ заяву наступнага зместу:

*«Желая искупить свою вину перед партией и Советской властью, прошу разрешить дать подробные показания о моей контрреволюционной нацдемовской деятельности, которую я, сознательно или бессознательно, вёл до самого дня моего ареста.*

*Игнат ДВОРЧАНИН»*[2]

---

[1] Місарэвіч Я. А., Каралёў М. Д. І. С. Дварчанін. Гісторыка-біяграфічны нарыс. С. 53–54.

[2] Цэнтральны архіў КДБ Рэспублікі Беларусь. С. 233771. Т. 6/10. С. 182.

Усяго ў 1934 г. па справе БНЦ было асуджана на працяглыя тэрміны зняволення ў працоўна-папраўчых лагерах і да іншых відаў пакарання 97 чалавек, у тым ліку 25 абвінавачаных прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання (прыговор прывялі ў выкананне 17 мая 1934 г.). 15 абвінавачаным расстрэл замянілі 10 гадамі пазбаўлення волі. Сярод іх былі Бурсевіч, Валошын, Валынец, Дварчанін і Рак-Міхайлоўскі. Сваё пакаранне Ігнат Сымонавіч адбываў на Салавецкіх астравах і будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала.

Праз тры гады, у лістападзе–снежні 1937 г. «тройка» УНКУС Ленінградскай вобласці пад старшынствам Л. Закоўскага (былога старшыні ДПУ БССР) адправіла на расстрэл Бурсевіча, Валошына, Валынца, Гаўрыліка, Дварчаніна, Рак-Міхайлоўскага. Што датычыцца Ігната Сымонавіча, то ён быў прыгавораны да расстрэлу 25 лістапада 1937 г., а расстраляны 8 снежня 1937 г.

Пры пераглядзе гэтай справы ў жніўні 1956 г. Камітэт дзяржаўнай бяспекі пры СМ БССР прызнаў, што яна была сфальсіфікавана. У пастанове аб спыненні следчай справы ад 16 жніўня 1956 г. падкрэслівалася:

*«Из оперативных материалов за 1934–1935 гг., приобщённых к следственному делу. Из жалоб обвиняемых Гаврилика, Бурсевича и Дворчанина за 1934–1936 годы и материалов расследования, произведённого в настоящее время, видно, что дело на них в 1933 году было сфальсифицировано. В действительности, как они заявляют, ни к каким контрреволюционным организациям не принадлежали, антисоветской работы не проводили и оговорили себя и проходящих по их показаниям лиц на следствии в 1933 году по причинам применения к ним незаконных методов ведения следствия.*

*Так, обвиняемый Дворчанин Игнатий 26 мая 1934 года заявил, что никакой программы БНЦ в действительности не существовало и она была составлена в 1933 году на следствии по предложению следователя...*

*В процессе проведенной проверки и дополнительного расследования по делу о существовании на территории Белоруссии контрреволюционной организации БНЦ не подтвердились, следовательно,*

*обвинение, предъявленное проходящим по делу всем обвиняемым, является необоснованным»*[1].

Па абедзвюх справах (1934 і 1937 гадоў) Ігнат Дварчанін быў рэабілітаваны 18 жніўня 1956 г.

Беларускі народ шануе памяць аб сваім выдатным сыне. Праз 27 год, у 1983 г. на хаце, дзе нарадзіўся Ігнат Сымонавіч, у вёсцы Погіры была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, а праз 33 гады пасля рэабілітацыі, у 1989 г. у г. п. Дзятлава на цэнтральнай плошчы быў адкрыт помнік (бронзавы бюст) Ігнату Дварчаніну. Дваццаць гадоў таму назад, 29 лютага 1996 г. Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь прысвоіў імя Ігната Дварчаніна Жукаўшчынскай сярэдняй школе Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці.

Застаецца толькі спадзявацца і пажадаць, каб творы і навуковыя працы арыгінальнага вучонага, паэта і палітыка Ігната Дварчаніна ўвайшлі ў школьныя і ўніверсітэцкія праграмы. Усё жыццё і дзейнасць Ігната Сымонавіча Дварчаніна, яго важкі ўклад у беларускую культуру варты таго, каб яго імя назаўсёды засталося ва ўдзячнай памяці беларускага народа.

---

[1] Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск: Беларусь, 1994. С. 92–93.